# § 27. Развіццё гарадоў, рамёстваў і гандлю на тэрыторыі Беларусі

МЯШЧАНЕ
МЯСТЭЧКА МАГІСТРАТ
ПРАСАЛЫ УРБАНІЗАЦЫЯ
ЦЭХІ МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА
РАДА РАТУША ГОСЦІ
ГОРАД ЮРЫДЫКА ЛАВА

Захаванне старых і будаўніцтва новых гарадоў

**1. Развіццё беларускіх гарадоў і мястэчак.** Аб'яднанне беларускіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця гарадоў. У XIV–XV стст. адбываўся іх рост і павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва, што было абумоўлена поспехамі ў развіцці эканомікі. Пашырылі сваю тэрыторыю Віцебск, Слуцк, Менск, Навагародак, Гародня, Бярэсце, вельмі хутка развіваўся Полацк. Побач са старымі з'яўляліся новыя, у асноўным невялікія гарады: Быхаў, Гальшаны, Капыль, Крэва і інш. Многія з іх узнікалі вакол крэпасцей, пабудаваных вялікімі князямі для абароны дзяржавы.

Фактары росту колькасці насельніцтва

Канцэнтрацыя ў гарадах рамесніцкай і гандлёвай дзейнасці спрыяла росту гарадскога насельніцтва. Яно павялічвалася шляхам натуральнага прыросту, перасялення ў гарады сялян, міграцыі яўрэяў і татараў, за кошт ваеннапалонных. У XV ст. найбольш густанаселеныя былі Полацк, Віцебск, Слуцк, Магілёў і Пінск. У Полацку, напрыклад, жыло каля 20 тыс. жыхароў. Аднак гарады з насельніцтвам 10 тыс. чалавек і больш былі рэдкаю з'явай. Пераважалі сярэднія гарады з колькасцю насельніцтва ў межах 2–4 тыс. чалавек (Гародня, Навагародак, Менск, Бярэсце і інш.).

Чым можна растлумачыць лідарства Полацка па колькасці насельніцтва?

### Асаблівасці забудовы беларускіх гарадоў

Да XV ст. цэнтрам буйнога беларускага горада быў умацаваны *дзяцінец*, дзе жылі князь і яго адміністрацыя. Каля сцен дзяцінца размяшчаўся рынак, куды сыходзіліся ўсе або найбольш значныя вуліцы горада. Асноўная частка гараджан — рамеснікі і гандляры — жыла ў неўмацаваным пасадзе. На месцы былога дзяцінца нярэдка будаваліся новыя, большыя памерамі, умацаваныя цэнтры — за́мкі. Ад XV ст. адбываюцца змены ў планіроўцы асобных гарадоў. Іх цэнтрам робіцца гандлёвая плошча з ратушай, вакол якой утвараюцца новыя пасады. Для беларускіх гарадоў, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх, была характэрная пераважна драўляная забудова. Толькі цэрквы і касцёлы, як правіла, узводзілі з цэглы і каменю. Новым элементам гарадской архітэктуры былі ўмацаваныя каменныя замкі, пабудаваныя ў XIV–XV стст. для абароны ад набегаў крыжакоў, напрыклад Лідскі замак, вакол якога пачало актыўна развівацца гарадское паселішча.

Як вы лічыце, чаму для беларускіх гарадоў была характэрная пераважна драўляная забудова?

Гарады паўставалі як на дзяржаўных, так і на прыватных землях. Жыхары прыватнаўласніцкіх гарадоў выконвалі павіннасці на карысць сваіх уладальнікаў. Насельніцтва ж дзяржаўных гарадоў лічылася вольным.

### З'яўленне мястэчак

У XV ст. на тэрыторыі Беларусі пачалі з'яўляцца *мястэчкі* (паселішчы, што займалі прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай). Іх узнікненне было абумоўлена развіццём гандлю і паступовым уцягваннем у рынкавыя адносіны сельскага насельніцтва, якое вымушана было прадаваць прадукцыю, вырашчаную на палях, каб выплаціць грашовыя павіннасці. Гэта прывяло да з'яўлення таргоў, якія арганізоўвалі ў розных месцах: каля замкаў, храмаў, на скрыжаваннях дарог, уздоўж берагоў рэк, азёр, нават каля гарадоў. У такіх месцах часта фарміраваліся мястэчкі. Іх жыхары належалі да мяшчанскага саслоўя, аднак апроч рамесніцка-гандлёвай дзейнасці займаліся таксама сельскагаспадарчай працай.

Мястэчкі выступалі ў якасці адміністрацыйных, гаспадарчых і рэлігійных цэнтраў валасцей, дробных вотчын. У буйны́м мястэчку цэнтрам была рыначная плошча, побач з якой месцілася царква (часцяком у суседстве з касцёлам), колькасць дамоў, як правіла, не перавышала 250–300. Ужо ў XVI ст. у Беларусі налічвалася больш за 300 мястэчак, але размяшчэнне іх было нераўнамернае: большасць прыпадала на яе заходнія землі. З цягам часу некаторыя мястэчкі прыходзілі ў занядад і ператвараліся ў вёскі, іншыя ж набылі статус гарадоў.

Як вы лічыце, чаму на захадзе Беларусі мястэчак было больш, чым на ўсходзе?

**Магдэбургскае права** — права гарадоў на самакіраванне.

**2. Пашырэнне магдэбургскага права.** У канцы XIV ст., пасля Крэўскай уніі, гарады Беларусі пачалі атрымліваць права на самакіраванне — так званае **магдэбургскае права** (на ўзор нямецкага горада Магдэбурга). Яно вызначала правы і абавязкі мяшчан. Вільня — першы горад ВКЛ, які атрымаў права на самакіраванне (1387 г.). Сярод беларускіх гарадоў такім лічыцца Бярэсце (**1390 г.**). У далейшым гэтае права атрымалі Гародня (1496 г.), Полацк (1498 г.), Менск (1499 г.) і інш.

Успомніце, калі еўрапейскія гарады пачалі барацьбу за атрыманне права на самакіраванне.

#### Змены ў становішчы мяшчан

Як вы лічыце, ці быў зацікаўлены вялікі князь літоўскі ў пераходзе гарадоў на самакіраванне?

У ВКЛ магдэбургскае права даравалася населенаму пункту прывілеем вялікага князя. Жыхары гарадоў, якія яго атрымлівалі, вызваляліся ад феадальных павіннасцей, суду і ўлады ваявод, старастаў і іншых дзяржаўных службовых асоб. Мяшчане стваралі органы мясцовага самакіравання, выбіралі ўласныя суды, кантралявалі фінансава-гандлёвую дзейнасць, адказвалі за абарону. Ім гарантаваліся вольныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам. Шматлікія натуральныя павіннасці, што існавалі да таго, замяняліся адзіным грашовым падаткам.

#### Органы гарадскога самакіравання

Згодна з магдэбургскім правам кіраванне горадам ажыццяўляў *магістрат* (выбарны адміністрацыйны і судовы орган), які складаўся з *рады* і *лавы*. Найвышэйшай службовай асобай у горадзе з'яўляўся *войт*, якога прызначаў вялікі князь або феадал (уладальнік

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Вытрымка з прывілея гораду Менску (1499 г.)**

«…мы, Аляксандр, з Божай ласкі вялікі князь літоўскі, рускі, жамойцкі і іншых [зямель]… даводзім да ведама гэтым нашым лістом… што, жадаючы прымножыць агульнае дабро і палепшыць стан нашага горада Менска… гэты наш горад… з права літоўскага і рускага… на права нямецкае, так званае магдэбургскае, пераводзім на вечныя часы. Пастанаўляем і даём ім магчымасць, згодна з гэтым магдэбургскім правам, чыніць поўную ўправу…

Жадаем таксама, каб усе жыхары названага горада Менска карысталіся гэтым правам магдэбургскім і ва ўсякай справе яго трымаліся. …Усіх тых людзей аддаляем ад гарадскога і баярскага права і навек вызваляем іх ад суду і ўлады ўсіх ваявод, паноў і старастаў… А як хто ў чым будзе вінны, мае па справядлівасці стаць перад войтам, бурмістрам і радцамі. Калі ж войт або бурмістры вырашаць няпраўдзіва, тады па гэтай справе маюць вызвацца да саміх нас і нам вырашаць, каго якім правам судзіць…».

1. *Што згодна з прывілеем атрымліваў горад Менск? Калі і кім быў выдадзены гэты дакумент?*
2. *З якой мэтай Менску давалася новае права?*
3. *Каму перадавалася судовая ўлада ў горадзе? За кім захоўвалася вярхоўнае права суду?*

горада) з асяроддзя шляхты або багатых мяшчан. Для вырашэння бягучых спраў войт мог выбраць сабе памочніка — *лентвойта*. Галоўным органам гарадскога самакіравання з'яўлялася *рада*. У яе склад уваходзіла ад 6 да 24 радцаў, якіх, як правіла, выбіралі штогадова на агульным сходзе мяшчан. На чале рады стаялі бурмістры (звычайна два), якія прызначаліся або зацвярджаліся войтам з ліку радцаў. Радзе належалі функцыі суду па грамадзянскіх і маёмасных справах. Апроч судовых функцый яна кіравала гаспадарчым жыццём горада: загадвала гарадской казной, усталёўвала цэны на асноўныя тавары, ажыццяўляла збор падаткаў і распараджалася імі, кантралявала дзейнасць рынкаў і рамесных цэхаў, займалася ўпарадкаваннем населенага пункта і забеспячэннем яго бяспекі, арганізоўвала абарону ў выпадку ваеннай

Як называюцца органы гарадскога самакіравання ў наш час? У чым адрозненні сучасных органаў гарадскога самакіравання ад сярэдневяковых?

пагрозы і інш. Па заканчэнні тэрміну сваіх паўнамоцтваў рада прадстаўляла войту і мяшчанам справаздачу. *Лава* — гэта гарадскі судовы орган па крымінальных справах, які ўзначальваўся войтам. Прадстаўнікі лавы *(лаўнікі)* абіраліся радай або прызначаліся войтам з ліку найбольш карысных для горада мяшчан.

Для магістрата ў гарадах будаваліся спецыяльныя будынкі — *ратушы*. У іх праводзілі пасяджэнні рады, размяшчалі органы гарадскога самакіравання, канцылярыю, казну, архіў, захоўвалі эталоны адзінак вагі і аб'ёму, сімвалы горада — герб, пячатку, прывілей на магдэбургскае права.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*1. Як называюцца будынкі, паказаныя на фатаграфіях? Для чаго яны ўзводзіліся?*
*2. Пералічыце агульныя элементы гэтых будынкаў.*
*3. Назавіце гарады, у якіх яны знаходзяцца.*






*4. Дзе яшчэ на тэрыторыі сучаснай Беларусі можна знайсці падобныя збудаванні?*
*5. Што цяпер размешчана ў гэтых будынках? Прывядзіце 1–2 прыклады.*

Адначасова з магдэбургскім правам гарады атрымалі магчымасць мець уласны герб. Ён прысутнічаў і на пячатцы горада.

### Адметныя асаблівасці магдэбургскага права ў гарадах Беларусі

Магдэбургскае права ў беларускіх гарадах мела свае асаблівасці. У прыватнасці, у ВКЛ адсутнічала выразнае размежаванне функцый паміж радай і лавай, войтаў прызначаў вялікі князь, мяшчане актыў-

на ўдзельнічалі ў выбарах органаў самакіравання, існавала пасада лаўніка, гараджане кантралявалі фінансавую дзейнасць рады.



Назавіце гарады, гербы якіх прадстаўлены на ілюстрацыях.

**Юрыдыкі — адасобленыя часткі гарадоў**

У мэтах умацавання свайго ўплыву і павелічэння прыбытку ў дзяржаўных гарадах магнаты і іншыя землеўладальнікі стваралі *юрыдыкі* (часткі горада, якія знаходзіліся пад уладай магната або царквы і не падпарадкоўваліся адміністрацыйнай і судовай уладзе магістрата). Паводле сучасных звестак, першыя з іх з'явіліся ў Берасці ў XV ст., пазней яны ўзніклі ў Мінску, Віцебску і іншых гарадах.

**Развіццё рамяства**

**3. Гарады — цэнтры рамяства і гандлю.** Асноўнымі заняткамі гарадскога насельніцтва ў другой палове XIII — XV ст., як і ў часы Старажытнай Русі, з'яўляліся рамяство і гандаль. Пры гэтым колькасць рамесніцкіх спецыяльнасцей істотна павялічылася. Найбольш пашыранымі рамёствамі, якія ўключалі значную колькасць прафесій, былі выраб адзення, тканін, прадуктаў харчавання, дрэваапрацоўка, будаўніцтва, апрацоўка футра, апрацоўка металу і выраб зброі. Сярод тых, хто спецыялізаваўся на апрацоўцы дрэва, вылучалі: рамеснікаў будаўнічых спецыяльнасцей (сталяры, пільшчыкі і інш.), рамеснікаў па вырабе транспартных сродкаў (вазоў, рачных суднаў і інш.), бандарных вырабаў (бочак, дзежак і інш.). Далейшае развіццё атрымала ганчарства. Формы і тыпы ганчарных вырабаў зрабіліся больш разнастайныя,

з'явілася аздабленне палівай. Значна пашырылася вытворчасць цэглы, дахоўкі, кафлі, што было выклікана павелічэннем аб'ёмаў будаўніцтва крэпасцей, замкаў, ратуш, культавых будынкаў. У XIV–XV стст. праца большасці гарадскіх рамеснікаў была накіравана на задавальненне асабістых, гаспадарчых і вытворчых патрэб мясцовага насельніцтва. Большая частка рамеснікаў працавала на заказы спажыўцоў. У той жа час з'явіліся рамесніцкія спецыяльнасці, прадстаўнікі якіх у сваёй дзейнасці арыентаваліся на рынак, — медавары, хлебнікі і інш. Напрыканцы XV ст. на землях ВКЛ узніклі першыя прафесійныя аб'яднанні рамеснікаў — *цэхі* (у 1495 г. у Вільні цэх злотнікаў і краўцоў). Аднак на тэрыторыі Беларусі цэхі былі зафіксаваныя толькі ў XVI ст.

**Развіццё грашовай сістэмы**

З пашырэннем сеткі гарадоў ішоў працэс развіцця ўнутранага і знешняга гандлю. Пашырэнне аброку ў сельскай гаспадарцы спрыяла павелічэнню таваараабмену паміж вёскай і горадам. Развіццю гандлю таксама дапамагала ўдасканаленне грашовай сістэмы. Ад XIV ст. найбольш распаўсюджанымі манетамі ў Еўропе і ВКЛ зрабіліся сярэбраныя пражскія грошы, якія паступалі з Чэхіі (адсюль і беларускае слова «грошы»). У канцы XIV ст. у ВКЛ пачалі вырабляць сярэбраны *«літоўскі дэнарый»*, або «пенязь». Праз стагоддзе быў створаны Віленскі манетны двор, які чаканіў грошы, паўгрошы і пенязі. Паступовa асноўнай падліковай адзінкай робіцца ка́па. У той час грашова-вагавая сістэма ВКЛ выглядала наступным чынам: 60 літоўскіх грашоў = 1 капа; 1 літоўскі грош = 10 пенязяў. У XVI ст. за адну капу можна было набыць чатыры каровы. З прычыны таго, што ўласнай манеты не хапала, у абарачэнні шырока прысутнічалі еўрапейскія (пераважна чэшскія і польскія) і рускія (наўгародскія) грошы.

**Асноўныя формы ўнутранага гандлю**

Галоўнымі формамі арганізацыі ўнутранага гандлю з'яўляліся кірмашы і таргі. Адзін або некалькі разоў на тыдзень у гарадах і мястэчках праводзіліся *таргі*, на якія з'язджаліся сяляне з навакольных вё-

сак. У якасці гандляроў маглі выступаць не толькі прафесійныя купцы, сярод якіх важнае месца займалі так званыя *прасалы*, што гандлявалі не далей чым за 10 вёрстаў ад свайго населенага пункта, але і прадстаўнікі іншых саслоўяў. На таргах прадавалі і куплялі соль, рыбу, рамесныя вырабы, тканіны, адзенне, абутак, збожжа, скуры, мёд. Больш значную ролю выконвалі *кірмашы*, якія праводзіліся ў гарадах і мястэчках адзін або некалькі разоў на год і прымяркоўваліся да пэўных рэлігійных свят. Яны збіралі купцоў не толькі з наваколля, але і з замежжа. Права на правядзенне кірмашоў было істотным дасягненнем горада і сведчыла пра яго важнасць.

**Развіццё знешняга гандлю**

Выгаднае геаграфічнае становішча ВКЛ дазваляла яму актыўна гандляваць з рознымі краінамі. Беларускія гарады падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з Польшчай, Чэхіяй, Венгрыяй, Маскоўскім княствам. Вялікую ролю адыгрываў транзітны гандаль. У краінах Еўропы беларускія купцы набывалі тканіны, металы і вырабы з іх, рыбу, упрыгажэнні, віны, садавіну і прысмакі. У Маскоўскім княстве аб'ектам куплі з'яўляліся футра і скура. Асноўным артыкулам экспарту ў ВКЛ была сыравіна — воск, скура, лён, пянька, лесаматэрыялы і прадукты іх перапрацоўкі: драўніна, паташ (попел) і іншыя тавары. У канцы XV ст., з павышэннем на Захадзе попыту на сельскагаспадарчыя прадукты, актывізаваўся экспарт збожжа. Знешнім гандлем займаліся заможныя купцы — *госці*.

Даведайцеся, чаму паташ быў важным экспартным таварам. У вытворчасці чаго ён выкарыстоўваўся?

**Шляхі зносін**

Гандаль ажыццяўляўся ўздоўж буйны́х рэк і сухапутных шляхоў — *гасцінцаў*. Па Нёмане, Віліі, Заходняй Дзвіне і Бугу гандлявалі з Польшчай, германскімі і скандынаўскімі дзяржавамі. Для гэтага выкарыстоўваліся разнастайныя рачныя судны — дубасы, стругі, байдакі. У зімовы час замерзлыя рэкі былі замест дарог, па якіх везлі груз «сухім ільдом». Асноўным транспартным сродкам былі вазы. У цэлым транспартная сістэма Беларусі ў XIV–XV стст. цалкам забяспечвала неабходны тавараабарот.

*У другой палове XIII — XV ст. на тэрыторыі Беларусі павялічылася колькасць гарадоў, яны ператварыліся ў гандлёва-рамесніцкія цэнтры. Гэтаму спрыяла атрыманне некаторымі з іх магдэбургскага права. Развіццё рамяства і гандлю стварыла ўмовы для паступовага ўключэння беларускіх зямель у сістэму еўрапейскіх эканамічных сувязей.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| Сярэдзіна XIV ст. — утварэнне Ганзейскага саюзу | 1390 г. — Брэсце стала першым горадам Беларусі, які атрымаў магдэбургскае права |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце асноўныя прычыны павелічэння колькасці гарадоў і гарадскога насельніцтва ў Беларусі ў другой палове XIII — XV ст.
2. Што такое мястэчка? Чым яно адрознівалася ад горада, вёскі?
3. Складзіце схему «Органы самакіравання ў гарадах з магдэбургскім правам і іх функцыі».
4. У чым заключаліся асаблівасці магдэбургскага права ў беларускіх гарадах у параўнанні з правам на самакіраванне ў Еўропе?
5. Дакажыце, што ў другой палове XIII — XV ст. беларускія гарады з'яўляліся цэнтрамі рамяства і гандлю.